3317 вучэбных установах з агульнай колькасцю навучэнцаў 1 816 476 колькасць членаў у маладзёжных і дзіцячых грамадскіх аб'яднаннях складала 295 743 навучэнцаў (16, 3%). Сярод іх: БПСМ – 5, 6%, БСМ – 1%, БРПО – 9, 7%. Такія маладзёжныя арганізацыі, як «Задзіночанне беларускіх студэнтаў», «Малады фронт» і іншыя, апазіцыйна настроеныя да праводзімай дзяржавай палітыкі, практычна не мелі сваіх структур у навучальных установах [5, л. 239].

Па-сутнасці, і БСМ і БПСМ у сваей дзейнасці мелі адны і тыя ж мэты – абарона інтарэсаў моладзі. Гэта былі і самыя масавыя арганізацыі рэспублікі. Усё ішло да таго, што рана ці позна яны павінны былі аб'яднацца, што адбылося 6 верасня 2002 г. на XXXVIII аб'яднаўчым з'ездзе ГА «БПСМ» і ГА «БСМ». Было прынята рашэнне аб аб'яднанні шляхам зліцця дзвюх найбольш вялікіх маладзёжных арганізацый Рэспублікі Беларусь у адзіную – грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» ( ГА «БРСМ») [1, с. 4].

Такім чынам, XXIX з'езд у 1990 г. захаваў арганізацыйнае адзінства ЛКСМБ, назву союза і пачаў яго дэпартызацыю. XXX з'езд камсамола Беларусі ў 1991 г. па сваіх задачах карэнным чынам адрозніваўся ад усіх папярэдніх. На адзначаным з'ездзе Саюз моладзі рэспублікі адрадзіўся на зусім новых асновах і прынцыпах дзеяння, але на вопыце і лепшых традыцыях усіх пакаленняў камсамольцаў. Для захавання арганізацыі была зменена яе назва – СМБ. Гэта была самая масавая маладзёжная арганізацыя ў Рэспубліцы Беларусь. У той жа час паралельна існавала мноства нефармальных маладзёжных аб'яднанняў. У 1997 г. быў створаны Беларускі патрыятычны саюз моладзі. Наяўнасць адных і тых жа мэт і задач дзейнасці прывяло да аб'яднання ГА «БПСМ» і ГА «БСМ» у «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» ў 2002 г. Але нішто не перашкаджала існваць іншым маладзёжным арганізацыям, хаця колькасны склад іх членаў быў невялікі. У сваю чаргу, Камітэт па справах моладзі ўзаемадзейнічаў з дзяржаўнымі органамі і ўсімі грамадскімі маладзёжнымі аб'яднаннямі для забеспячэння аптымальных арганізацыйна-прававых і эканамічных умоў развіцця маладзёжнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь.

*Літаратура і крыніцы*


1. В будущее – вместе с нами: материалы объед. съезда обществ. об-ний «Бел. патриот. союз молодёжи» и «Бел. союз молодёжи»: Основ. нормат. док. и прогр. общественного объединения «Бел. респ. союз молодёжи» / редкол. А. В. Нахаенко [и др.]. – Минск: Бел. Дом печати, 2003. – 128 с.
2. Ведамасны архіў Міністэрства адукацыі РБ. Фонд Дэпартамента па справах моладзі. – Воп. 1. – Спр. 1.
3. Там жа. Спр. 3
4. Там жа. Спр. 73.
5. Там жа. Спр. 98.
6. *Данилов, А.Н.* Молодёжь кризисных лет: иллюзии и новые надежды / А.Н. Данилов. – Минск: ООО «Харвест», 1999. – 320 с.
7. Новости НИСЭПИ. – 1998. – Вып. 4., дек.
8. Новости НИСЭПИ. – 1999. – Вып. 5., март.
9. *Котляров, И.В.* Молодежь Беларуси на пороге XXI века: социологический анализ / И. В. Котляров. – Минск: Белинформпрогноз, 1997. – 107 с.
10. *Медведева, Л.Ф.* Молодежные общественные организации и движения в Республике Беларусь: учеб.-метод. пособие / Л.Ф. Медведева. – Минск: Академия управления при Президенте Республики Беларусь, 2000. – 45 с.
11. Молодежь Беларуси // Информационный вестник. – 1998. – № 6.
12. Молодежь и демократизация Советского общества / под ред. С.А. Щавеля [и др.]. – Минск: «Навука і тэхніка», 1990. – 136 с.
13. Молодежь – 88: Докл. науч. сес., март 1988 / редкол. И.М. Ильинский [и др.]. – Москва: ВКШ, 1989. – 264 с.
14. НАРБ. – Ф. 63. – Воп. 7. Спр. 1155.
15. НАРБ. – Ф. 63. – Воп. 7. Спр. 1157.
16. НАРБ. – Ф. 63. – Воп. 7. Спр. 1180.
17. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 7. Спр. 1156.
18. НАРБ. – Ф. 968. – Воп. 1. Спр. 2617.
19. Навукова-метадычная ўстанова «Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці». – Ф. 25. – Воп. 51. – Спр. 198.
20. Навукова-метадычная ўстанова «Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці». – Ф. 25. – Воп. 51. – Спр. 205.



*Summary*

*The article has analyzed the evolution of youth movement and the development of state youth policy in Belarus at the end of XX$^{th}$ cent – and the beginning of XXI centuries.*


---

*УДК 947«1914/1917»*

***М.М. Забаўскі***

# РАСІЙСКАЕ САМАЎЛАДДЗЕ Ў ПЕРЫЯД САЦЫЯЛЬНЫХ І ПАЛІТЫЧНЫХ УЗРУШЭННЯЎ (1914–1917 гг.)

Размеркаванню палітычных сіл у Расійскай імперыі і крызісу самаўладдзя ў апошнія гады яго існавання прысвяцілі свае мемуары шматлікія ўдзельнікі падзей пачатку XX ст. У прыватнасці, пра імператара Мікалая II, лёс яго сям'і, думскай манархіі (1907–1914 гг.)

пісаў С.С. Альдэнбург [1]. Адзін з вядомых палітычных дзеячаў царскай Расіі, акцябрыст В.В. Шульгін у кнізе «Годы» нагадваў аб перадрэвалюцыйным дзесяцігоддзі. Успаміны «Дни» ён прысвяціў падзеям лютага 1917 г. і абставінам, звязаным з адмаўненнем ад трона Мікалая II, і больш познім падзеям [2].

Узаемаадносіны думскай большасці з царызмам, дзейнасць Прагрэсіўнага блока ў IV Дзяржаўнай думе адлюстравалі ў мемуарах старшыня III і IV Думы М.У. Радзянка [3] і лідэр фракцыі трудавікоў, потым кіраўнік Часовага ўрада А.Ф. Керанскі [4]. Грунтоўнай крыніцай па вылучанай тэме з'яўляюцца дарэвалюцыйныя газеты, у праватнасці, кадэцкая «Речь» і орган друку прагрэсістаў – «Утро России». Найбольш значнымі выданнямі манархічнага, праўрадавага кірунку, якія паўплывалі на светапогляд насельніцтва, уяўлялі навуковую і палітычную цікавасць, былі газеты «Окраины России» (Санкт-Пецярбург), «Белая Русь» (Вільня), «Минская речь» (Мінск), «Минское слово» (Мінск), часопіс «Крестьянин» (Вільня) і інш.

Грамадска-палітычная барацьба ў Расіі, у тым ліку і ў заходніх губернях, дзейнасць ліберальнай апазіцыі адлюстраваны ў працах беларускіх даследчыкаў. Расклад палітычных сіл ў I – IV Думах, у тым ліку дзейнасць мірнаабнаўленцаў, затым прагрэсістаў і Прагрэсіўнага блока ў 1912–1917 гг. часткова аналізуе М.М. Забаўскі [5]. Дзейнасці масонскіх лож у Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XX ст. прысвечаны зборнік артыкулаў пад агульнай рэдакцыяй А.М. Смалянчука [6]. Яму належыць манаграфія, якая раскрывае сутнасць «краёвай ідэалогіі», дзейнасць літоўскіх і беларускіх палякаў у другой палове XIX ст. – 1917 г. [7]. Больш за два дзесяткі навуковых публікацый і манаграфія пра дзейнасць ліберальнай апазіцыі ў IV Дзяржаўнай думе падрыхтаваны Д.С. Лаўрыновічам [8].

Уступленне Расійскай імперыі ў Першую сусветную вайну прывяло да ўсплёску шавіністычных настрояў у краіне. На кароткі тэрмін былі забыты палітычныя рознагалоссі. Правыя, акцябрысты і прагрэсісты ўключыліся ў антыгерманскую кааліцыю. 26 ліпеня 1914 г. ад імя партыі кадэтаў аб поўнай падтрымцы ўрада выступіў П.М. Мілюкоў. Толькі сацыял-дэмакратычныя фракцыі вылучылі заяву, у якой падкрэслівалася, што адказнасць за распачатую вайну нясуць урадавыя колы ўсіх краін, і заклікалі да міжнароднай салідарнасці працоўных. Але хутка меншавікі перайшлі на абарончыя пазіцыі, а члены бальшавіцкай фракцыі былі сасланы ў Сібір. З сацыялістаў у Думе засталіся меншавікі на чале з М.С. Чхеідзе і трудавікі, якіх узначальваў А.Ф. Керанскі.

У выніку ваенных паражэнняў вясны-лета 1915 г. расійскія войскі вымушаны былі пакінуць значную тэрыторыю. Пачаўся крызіс транспарту, прамысловасці, узрасла інфляцыя. Рэзка змянілася палітычная сітуацыя. М.У. Радзянка, які наведаў тэатр ваенных дзеянняў, выступіў у Думе з прапановай стварыць спецыяльны дарадчы орган, якому было б даручана вярхоўнае кіраўніцтва ўсім забеспячэннем арміі. У яго склад павінны былі ўвайсці і прадстаўнікі заканадаўчых палат. З мая 1915 г. члены Дзяржаўнага савета і Дзяржаўнай думы атрымалі магчымасць удзельнічаць у кіраванні ваеннай эканомікай.

На канферэнцыі кадэцкай партыі 6–8 чэрвеня 1915 г. ў Петраградзе П.М. Мілюкоў выступіў з ініцыятывай стварыць Прагрэсіўны блок.

Група прагрэсістаў-нацыяналістаў склалася вакол В.В. Шульгіна ў рускай нацыянальнай фракцыі. Яны дапускалі магчымасць пагаднення на патрыятычнай аснове не толькі з акцябрыстамі, а нават з кадэтамі і прагрэсістамі [2, с. 114]. Пазней прыхільнікі В.В. Шульгіна выйшлі з фракцыі нацыяналістаў наогул і ўтварылі сваю – прагрэсіўных нацыяналістаў.

У ліпені 1915 г. былі распачаты сесіі Дзяржаўнай думы і Дзяржаўнага савета. З праграмай савета міністраў у Думе выступіў І.Л. Гарамыкін. У якасці асновы для сумеснай працы прэм'ер указаў толькі на законапраекты, выкліканыя запатрабаваннямі вайны. Урад не жадаў дапускаць думцаў да ўдзелу ў абмеркаванні пытанняў дзяржаўнай палітыкі, што выклікала непаразуменне і незадавальненне думскай большасці. З патрабаваннямі стварыць «урад даверу» выступілі ад фракцыі рускіх нацыяналістаў У.А. Бобрынскі, ад кадэтаў – П.М. Мілюкоў, прагрэсістаў – І.М. Яфрэмаў. Гэта была прыкмета кансалідацыі думскіх фракцый у Прагрэсіўны блок. У яго ўвайшлі шэсць фракцый Дзяржаўнай думы (прагрэсісты, нацыяналісты-прагрэсісты, група «Саюз 17 октября», земцы-акцябрысты, кадэты і група цэнтра) і некалькі членаў Дзяржаўнага Савета (цэнтр, акадэмічная група і беспартыйныя). Разам яны абралі бюро ў складзе 25 чалавек пад старшынствам члена Дзяржаўнага савета У.У. Меляр-Закамельскага. Бюро, якое валодала большасцю ў 236 дэпутатаў супраць 187, стала кіраваць IV Думай. Усяго ж у блок разам з членамі Дзяржаўнага Савета ўвайшлі больш за 300 чалавек [2, с. 292]. Галоўнымі патрабаваннямі блока былі: стварэнне «міністэрства даверу», адказнага перад Думай, частковая палітычная амністыя, увядзенне валаснога земства, аднаўленне дзейнасці прафсаюзаў, формула «аб уступленні на шлях адмены абмежавальных законаў для яўрэяў». З гэтай праграмай пагадзіліся нават правыя. Пярэчанні з іх боку выклікала

толькі апошняя «формула», але ўрэшце і яны заўважылі, што «кіруючае яўрэйства» ў 1914 г. зрабіла стаўку на «патрыятызм». «Увесь расійскі друк (а ён на тры чвэрці быў яўрэйскім) патрабаваў вайны да пераможнага канца», – успамінаў пазней В.В. Шульгін [2, 96]. Для яго ўвесь сэнс стварэння блока быў у тым, каб «супакоіць масы, папярэдзіць рэвалюцыю і тым самым даць уладзе магчымасць давесці вайну да канца» [2, с. 440].

Найбольшая эфектыўнасць ад працы Прагрэсіўнага блока назіралася ў жніўні-верасні 1915 г. У гэты час яго кіраўніцтва неаднаразова прадпрымала спробы дасягнуць пагаднення з вярхоўнай уладай па праблеме ўтварэння «міністэрства даверу».

Жыццё краіны залежала ад падзей на фронце. Да канца жніўня 1915 г. на поўдні руская армія перайшла да асобных наступальных аперацый. Хуткімі тэмпамі ў краіне развівалася ваенная прамысловасць. Будаваліся новыя казённыя заводы, з саюзнікамі было дасягнута фінансавае пагадненне адносна аплаты вялікіх заказаў – пераважна ў Амерыцы і ў Вялікабрытаніі. У такіх умовах Мікалай II і яго акружэнне не лічылі мэтазгодным прыслухоўвацца да ліберальных рэфарматараў. Пастаянную барацьбу супраць блока вяло правае крыло дэпутацкага корпуса. Яго галоўнымі прадстаўнікамі былі Г.Г. Замыслоўскі дэпутат ад «рускага» насельніцтва Віленшчыны і велікарускі нацыяналіст М.Я. Маркаў. Адказам на палітычную актывізацыю Думы стаў указ аб яе датэрміновым роспуску з верасня 1915 г. Міністры, якія выступалі за пагадненне з думскім блокам, былі звольнены [5, с. 145].

Толькі ў кастрычніку 1915 г. Прагрэсіўны блок ачуняў ад удару, нанесенага ўрадам. 25 кастрычніка адбылося пасяджэнне дзвюх фракцый Дзяржаўнай думы і Дзяржаўнага Савета (кадэты і цэнтр) з прадстаўнікамі Ваенна-прамысловага камітэта, земскага і гарадскога саюзаў. На парадку дня стаялі пытанні аб ацэнцы палітычнай сітуацыі ў краіне і аб прыняцці адзінай тактычнай лініі ў адносінах да Думы. Пасяджэнні бюро Прагрэсіўнага блока працягваліся да канца лістапада. Пасля працяглых ваганняў урад аднавіў работу Думы 9 лютага 1916 г. У гэты дзень першы і апошні раз IV Думу наведаў Мікалай II. Яго з'яўленне павінна было прадэманстраваць грамадству перамену ў адносінах манарха да парламента. Пра гэта сведчыла і адстаўка прэм'ер-міністра І.Л. Гарамыкіна ў студзені 1616 г. На яго месца быў прызначаны Б.У. Шцюрмер. У сваёй прамове Мікалай II заклікаў дэпутатаў выконваць свой абавязак перад Радзімай, адзначыў важнасць сумеснай працы ўрада і дэпутатаў. Аб'ектыўна візіт садзейнічаў умацаванню прававых канстытуцыйных пачаткаў. Але сітуацыя змянілася, калі ў Думе выступіў новы прэм'ер-міністр Б.У. Шцюрмер і адразу зрабіў спробу «прыручыць» Думу, акцэнтуючы ўвагу на недатыкальнасці гістарычных устояў расійскай дзяржаўнасці.

Дэпутаты адчулі, што атрымалі новы варыянт І.Л. Гарамыкіна і імкнуліся засяродзіць акцэнт дэбатаў на развал эканомікі, рост карупцыі і стварэнне ўрада грамадзянскага даверу з асоб, якія гатовы працаваць у згодзе з Думай [5, с. 145].

Зразумеўшы, што кампрамісу з урадам не дасягнуць, П.М Мілюкоў заявіў, што пры захаванні існуючай палітычнай сістэмы Расія ў вайне не пераможа. І завяршыў сваё выступленне словамі: «Ад гэтага ўрада я не чакаю адказу і пакідаю кафедру без адказу» [2, с. 417]. Парламент успрымаўся царызмам як «унутраны вораг», які, па словах былога міністра ўнутраных спраў В.А. Маклакова, быў «больш небяспечны і больш нахабны, чым вораг знешні» [10, 402].

Увосень 1916 г. унутрыпалітычная сітуацыя зноў абвастрылася. Прагрэсіўны блок прыняў агульную платформу: патрабаваць адстаўкі Б.У. Шцюрмера, дабівацца адмены законаў, прынятых на падставе артыкула 87 Поўнага збору законаў Расійскай імперыі. 1 лістапада 1916 г. Старшыня Думы М.У. Радзянка выступіў з патрыятычным зваротам у такім тоне, што прэм'ер-міністр разам з урадам пакінулі залу пасяджэння Думы. А.Ф. Керанскі і П.М. Мілюкоў нанеслі рашаючы ўдар па Б.В. Шцюрмеру. Яны фактычна абвінавацілі ўрад у дзяржаўнай здрадзе. Дума запатрабавала адстаўкі старшыні Савета міністраў. У падтрымку гэтых патрабаванняў выступілі грамадства і друк.

Цар быў вымушаны адправіць Б.У. Шцюрмера ў адстаўку. Ужо 19 лістапада 1916 г. новы прэм'ер-міністр А. Трэпаў выступаў у Думе. Але думцам прымірэння ўжо было недастаткова, яны жадалі ўлады.

Пазней М.У. Радзянка ўспамінаў, што ў канцы 1916 г. да яго неаднаразова звярталіся прадстаўнікі вышэйшага грамадства з заявай, што «...Дума і яе старшыня абавязаны ўзяць на сябе адказнасць перад краінай і выратаваць армію і Расію» [3, с. 36]. Але спікер IV Думы лічыў, што «дварцовыя перавароты не справа заканадаўчых палат» [3, с. 36–37].

М.У. Радзянка дамагаўся аўдыенцыі ў Мікалая II. 7 студзеня 1917 г. ён быў прыняты царом. Старшыня Думы імкнуўся давесці да правячай вярхушкі стан сапраўднага эканамічнага і асабліва палітычнага становішча краіны. М.У. Радзянка заявіў, што ўся Расія ў адзін голас патрабуе змены ўрада і прызначэння адказнага прэм'ера.

«Урад адсутнічае, – тлумачыў старшыня Думы, – сістэмы няма, са складу ўрада выведзены дзяржаўныя дзеячы, якія карысталіся даверам Думы і народа» [3, с. 40].

Тым не менш, у лютаўскую сесію 1917 г. Прагрэсіўнаму блоку не ўдалося дасягнуць змен у складзе царскага ўрада. Аднак яго кіраўнікі сфарміравалі часовы камітэт Думы і ўступілі ў перамовы з імператарам і ўрадам. Урэшце яны сфарміравалі Часовы ўрад.

У свой час царскі ўрад шукаў падставы разагнаць «нелаяльную» Думу і «зваліць» на яе прычыны безнадзейнага стану і няздольнасць працягваць вайну з боку Расійскай імперыі. 23 лютага (8 сакавіка) 1917 г. у Міжнародны жаночы дзень у Петраградзе пачаліся перабоі ў гандлі хлебам, што выклікала стыхійныя хваляванні. 27 лютага (12 сакавіка) рух перарос ва ўзброенае паўстанне, якое завяршылася перамогай у сталіцы народнай рэвалюцыі. Таго ж дня старшыня Думы М.У. Радзянка атрымаў указ Мікалая II аб роспуску IV Дзяржаўнай думы.

Гэта быў апошні царскі ўказ і канец існавання дарэвалюцыйнай расійскай Думы. Супрацьстаянне цара з Думай завяршылася. М.У. Радзянка накіраваў тэлеграму імператару, які знаходзіўся ў Стаўцы ў Магілёве, і камандуючаму франтамі з паведамленнем аб парушэннях грамадскага парадку, якія ўзмацніліся ў Петраградзе.

Лідэры ліберальных партый настойвалі на неабходнасці тэрмінова пачаць афіцыйнае пасяджэнне Думы, нягледзячы на ўказ аб яе роспуску. Шматлікія дэпутаты патрабавалі, каб мінавіта Дума абвясціла сябе вышэйшым органам улады ў краіне.

Між тым (01.03 (13 сакавіка)) падзеі ў сталіцы набывалі некантралюемы характар. Палкі пакідалі свае казармы без афіцэраў. Рэвалюцыйныя войскі цалкам авалодалі сталіцай. З’явіліся тысячы дэманстрантаў.

У гэты перыяд (01.03.(13 сакавіка)) узнікла ўжо два цэнтры ўлады: створаны на неафіцыйным думскім пасяджэнні ў якасці кіруючага органа Часовы ўрад і Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Часовы ўрад Расіі на чале з князем Львовым абавязаўся забяспечыць у краіне дэмакратычныя правы і свабоды, склікаць Устаноўчы сход. Кіраўнікі Савета (памяркоўныя сацыял-дэмакраты і сацыял-рэвалюцыянеры) праз працяглы этап эвалюцыйнага развіцця на аснове капіталістычнай эканомікі і парламенцкай дэмакратыі накіроўвалі народы расійскай імперыі па шляху сацыялізму.

Мікалай II (02.03.(15 сакавіка)) адрокся ад прастола. Прадстаўнікі думскага кабінета, лідэры акцябрыстаў В.В. Шульгін і А.І. Гучкоў выехалі ў Пскоў, дзе знаходзіўся імператар і практычна вымусілі апошняга падпісаць Маніфест аб адрачэнні ад трона.

Такім чынам, у лютым 1917 г. адбылася сацыяльная рэвалюцыя (буржуазна-дэмакратычная на змесце), у выніку якой было ліквідавана царскае самаўладдзе. Рэвалюцыя ажыццяўлялася ва ўмовах эканамічнага і палітычнага крызісу. Прагрэсіўны блок не змог выступіць адзінай палітычнай сілай, што сведчыла аб раз’яднанасці і слабасці ліберальнай апазіцыі.

Галоўная прычына таго, што Дума не выканала сваёй гістарычнай місіі – не вырашыла галоўных пытанняў грамадска-палітычнага жыцця – была ў адсутнасці падтрымкі яе з боку асноўнай масы насельніцтва. У Расіі адсутнічала традыцыя цывілізаваных палітычных паводзін і кампраміснага вырашэння сацыяльных і палітычных канфліктаў. Пераацэньваў ролю Думы імператар і падначалены яму ўрад.

Сацыяльныя і палітычныя ўзрушэнні летавосені 1917 г. засведчылі няздольнасць Расійскай імперыі функцыяніраваць у дэмакратычным рэжыме. Часовы ўрад не здолеў стабілізаваць эканоміку і склікаць Устаноўчы сход. Расія рухалася да левaрадыкальнай дыктатуры. Беларуская палітычная эліта не змагла вызначыцца ў выбары ўласнага шляху пабудовы дзяржавы. 25 кастрычніка 1917 г. у Петраградзе быў звергнуты Часовы ўрад А.Ф. Керанскага. Уладу захапіў Ваенна-рэвалюцыйны камітэт Петраградскага савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў і перадаў яе II Усерасійскаму з’езду саветаў. Адносна хуткая перамога Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Беларусі тлумачыцца глыбокімі палітычным і эканамічным крызісамі, якія былі вынікам Першай сусветнай вайны і кіравання краінай царскім, затым Часовым урадам. Па меркаванні працоўных мас, выхад з крызіснага становішча давалі дэкрэты аб міры, аб зямлі. Рэвалюцыя зрабіла працяг вайны немагчымым. У той жа час да будаўніцтва новага жыцця Расія была не гатова. Па словах акадэміка І.М. Ігнаценкі, «…старыя пануючыя класы не знайшлі сабе месца ў новых абставінах, а новыя, з’яўляючыся культурна адсталымі, не змаглі ў той жа час ускласці на сябе задачу будаўніцтва новага грамадства» [11, с. 62].

*Літаратура і крыніцы*


1. *Ольденбург, С.С.* Царствование императора Николая II / С.С. Ольденбург. М.: АО «Молодая гвардия». – 1992. – 256 с.
2. *Шульгин, В.* Годы – Дни – 1920 / В. Шульгин. – М.: «Новости». – 1990. – 828 с.
3. Радзянка М.В. За кулисами царской власти / М.В. Радзянка. – М.: «Панарама», 1991. – 47 с.
4. *Керенский, А.Ф.* Руская революция 1917 / А.Ф. Керенский. – М.: Центрполиграф, 2005. – 383 с.

5. *Забаўскі, М.М.* Расійская Дзяржаўная дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі (1906–1917 гг.) / М.М. Забаўскі. – Мінск: БДПУ, – 1999. – 212 с.
6. Вольныя муляры ў беларускай гісторыі канец XVIII – пачатак XX ст.: зб. навук. арт. / «Gudas»; навук. рэд. А.Ф. Смалянчук. – Вільня, 2005. – 277 с.
7. *Смалянчук, А.* Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях 1864–1917 гг. / А. Смалянчук. – СПб.: «Неўскі прасцяг», 2004. – 404 с.
8. *Лавринович, Д.С.* Прогрессивный блок и создание органов государственной власти (февраль – май 1917 г.) / Д.С. Лавринович // Гістарычная навука ў Белдзяржуніверсітэце на рубяжы тысячагоддзяў: матэрыялы Рэсп. навук.-прак. канф., прысвеч. 65-годдзю заснавання гіст. ф-та Белдзяржуніверсітэта, 26 лістап. 1999. – Мінск, 2000. – С. 263–265; *Ён жа*. Дзейнасць Прагрэсіўнага блока ў IV Дзяржаўнай думе // Беларускі гістарычны часопіс. – 2001 – № 6. – С. 35-41.
9. РДГА. – Ф. 1278. – Воп. 5. – Спр. 1124.
10. *Милюков, П.* Воспоминания / П. Милюков. – М.: Изд. Политической литературы, 1991. – 512 с.
11. *Ігнаценка, І.І.* Працяг рэвалюцыйнага працэсу / І.І. Ігнаценка // Гісторыя Беларусі. – Т. 5. – Беларусь у 1917–1945 гг.- Мінск: Экаперспектыва, 2006.



SUMMARY

*In the article the author analyses the activity of the Russian tsarism in 1914–1917. Special attention is paid to the opposition of the Duma's majority and the Tsar's government and to the reasons that led to the economic and political crisis in the country and influenced on the events of 1917.*


*УДК 947.083*

***У.С. Пуцік***

# УКАЗ АБ ВЕРАЦЯРПІМАСЦІ І АКТЫВІЗАЦЫЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ РЭЛІГІЙНЫХ КАНФЕСІЙ Ў БЕЛАРУСІ

Расія на працягу шматвяковай гісторыі няўхільна пашырала сваю тэрыторыю як мірным шляхам, так і ў выніку ваенных дзеянняў. Галоўным жа сродкам умацавання адзінства шматнацыянальнай імперыі царскія ўлады не без падстаў лічылі русіфікацыю далучанага насельніцтва. Актыўным праваднікам гэтага курсу ўрада з'яўлялася Праваслаўная Царква. Таму яна вымушана была пастаянна прыстасоўвацца да пераўтварэнняў, якія адбываліся ў краіне. У канцы XIX – пачатку XX ст. ва ўмовах нарастання рэвалюцыйнага крызісу, царква становіцца адным з актыўных удзельнікаў грамадска-палітычнага жыцця.

Пры гэтым русіфікатарская сутнасць дзейнасці Праваслаўнай Царквы ва ўмовах моцнага ўздыму грамадска-палітычнай актыўнасці ў краіне значна ўзмацнілася. Не прывёў да істотных перамен у гэтых адносінах і царскі ўказ аб верацярпімасці ад 17 красавіка 1905 г. У гэты перыяд абвастрылася ў Расіі праблема ўрэгулявання канфесіянальна-нацыянальных адносін. Сітуацыя, што склалася ў краіне, сведчыла пра тое, што палітыка цэнтралізацыі і русіфікацыі пагражае самой цэласнасці Імперыі [1, с. 57].

Беларусь увайшла ў склад Расійскай імперыі ў канцы XVIII ст. Яна заставалася рэгіёнам, у якім грамадска-палітычная, сацыяльна-эканамічныя, дэмаграфічныя і іншыя працэсы вызначаліся шэрагам істотных асаблівасцей. Адметным з'яўлялася тое, што тут (на адносна абмежаванай тэрыторыі) пражывала акрамя беларусаў шэраг іншых народнасцей. Гэта акалічнасць стала прычынай узнікнення шматканфесіянальнасці і вызначала асаблівы каларыт усяго рэлігійнага жыцця ў краі.

Узмацненне русіфікацыйнай скіраванасці ў дзейнасці Праваслаўнай Царквы на рубяжы XIX–XX ст. прывяло не проста да актыўнага ўключэння яе ў палітычнае жыццё, але і да абвастрэння міжканфесіянальных адносін у краі. Найбольш актывізавалася тут антырусіфікацыйная дзейнасць католікаў, пратэстантаў і інш. А гэта азначае, што русіфікацыя не толькі вызначала сутнасць імперскай палітыкі царскага ўрада ў Беларусі ў азначаны перыяд, але і непасрэдна ўплывала на рэлігійнае жыццё ў краі, дзейнасць яго інстытутаў.

Аднак гісторыкі ў сваіх даследаваннях па праблемах гісторыі рэлігіі ў Беларусі на гэту акалічнасць не звярталі істотнай увагі і абмяжоўваліся фармальным апісаннем дзейнасці рэлігійных устаноў і канфесій. У савецкі перыяд шматаспектная праблематыка канфесіянальнай гісторыі зводзілася да класавай абумоўленасці дзейнасці духавенства ва ўсіх без выключэння сферах жыцця.

У наш час беларускія гісторыкі надаюць значную ўвагу распрацоўцы пытанняў канфесіянальнай гісторыі Беларусі. Асаблівую цікавасць выклікае тэма міжканфесіянальных адносін у другой палове XIX – пачатку XX ст., якой прысвечаны даследаванні В.В. Грыгор'евай, У.М. Завальнюка, У.І. Навіцкага, А.М. Філатавай [2]. На пад-